МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ І НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

САВЕТ ПА НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОЦЕ СТУДЭНТАЎ

ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

КАФЕДРА ГІСТОРЫІ СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ І СЯРЭДНІХ ВЯКОЎ

# МАТЭРЫЯЛЫ

## ВЫКЛАДЧАСКА-СТУДЭНЦКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ "ЛІСТАПАДАЎСКІЯ СУСТРЭЧЫ" У ГОНАР М.М. НІКОЛЬСКАГА І У.М. ПЕРЦАВА

(14 - 15 лістапада 1995 г.)

Мінск, 1996

**Сушкевіч Л. П., Рэвяко К. А.**

## УЛАДЗІМІР МІКАЛАЕВІЧ ПЕРЦАЎ -- ПЕДАГОГ І ВУЧОНЫ (1877--1960 ГГ.)

Уладзімір Мікалаевіч Перцаў закончыў гісторыка-філалагічны факультэт Маскоускага ўніверсітэта у 1903 г. Шырокая эрудыцыяя і глыбокія веды маладога даследчыка у галіне гістарычных навук звярнулі на сябе ўвагу кіраўніцтва ўніверсітэта і ён быу астаўлены для падрыхтоукі да прафесарскага звання. У той жа час Уладзімір Мікалаевіч пачаў працаваць у сярэдніх на-

вучальных установах Масквы, але гараданачальнік адказау маладому вучонаму ў выдачы пасведчання аб палітычнай надзейнасці, матывіруючы ўдзелам яго ў студэнцкіх хваляваннях. Выкладчыцкую дзейнасць ён змог узнавіць толькі у 1905 г., а у 1921 г. быу запрошаны на пасаду прафесара у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. У Мінску У.М.Перцау чытаў лекцыі не толькі ва ўніверсітэце, але і у другіх інстытутах горада, а таксама у Віцебску і Магілёве.

Да адкрыцця гістарычнага факультэта, Уладзімір Мікалаевіч працаваў на педагагічным факультэце БДУ. Ен выкладау курс гісторыі Старажытнай Грэцыі. Распрацаваная ім праграма захавалася да нашага часу. Праграма сведчыць аб тым, што вучоны прызнавау развіццё феадалізму і капіталізму у Старажытнай Грэцыі. У паясняльнай запісцы да праграмы ён пісаў, мадэрнізуючы перыяд: "Гамэрауская эпоха характарызуецца як эпоха грэчаскага сярэднявечча з усімі характэрнымі рысамі феадальнага ладу. Пачатак разлажэння грэчаскага феадалізму падае на эпоху каланізацыі Міжземна- і Чарнаморскага ўзбярэжжаў на працягу якой у Грэцыі выспяваюць новыя сілы ў выглядзе ствараючагася гандлёвага капіталу і грашовай гаспадаркі" (1).

Складзеная У.М.Перцавым праграма практычных заняткаў (семінара) па гісторыі Старажытнай Грэцыі сведчыць не толькі аб высокім навуковым майстэрстве, але і аб яго грунтоўным педагагічным узроўні. У аснову было пакладзена вывучэнне паэм Гамэра "Іліяда" і "Адысея" і напісанне па гэтых творах рэфератаў. Вучоны заўважае, што на гамэраўскіх паэмах прыйшлося астанавіцца таму, што студэнты не ведаюць старажытнай мовы грэкаў, між тым як паэмы ёсць у добрым стане і даступны для студэнтаў. Тэмы рэфератаў даволі цікавыя, яны выконваюцца студэнтамі і у сучасны момант: "Землеўладанне і жывёлагадоўля у Гамэраўскую эпоху", "Буйная гаспадарка Гамэраўскай эпохі", "Натуральна-гаспадарчы лад", "Рамяство", "Рабы", "Камендацыя і васалітэт", "Цары", "Арыстакратыя", "Народны сход", "Гандаль і нацыянальны склад купецкага класа", "Сістэма землеўладання" (2).

У.М.Перцау адносіўся да той катэгорыі вучоных, для якіх чытанне лекцый і правядзенне практычных заняткау было не

толькі прафесійным майстэрствам, але і выкананнем глыбокай арганічнай жыццёвай неабходнасці. Без пастаянных сувязей са студэнтамі, без клопатау аб лёсе сваіх вучняў, без неперарыўнай перадачы сваіх ведаў ён не мог існаваць. Таму сотні вучняў прафесара У. М. Перцава і зараз яшчэ працуюць у вышэйшых навучальных установах не толькі Беларусі, а і за яе межамі, а тысячы яго выхаванцаў у сярэдніх школах перадаюць свае веды падрастаючаму пакаленню.

У дапамогу студэнтам і выкладчыкам вучоны-педагог апублікавау артыкул "Аб форме ўласнасці ў антычным грамадстве"(3). Нягледзячы на марксісцкі падыход да вырашэння складанага пытання, аутар справядліва адзначыў, што першай формай уласнасці была племянная, уласцівая першабытнаабшчыннаму ладу. Што ж датычыцца рабаўладальніцтва, то афарміл[ася] другая форма ўласнасці -- антычная абшчынная і дзяржаўная. Ён прадаўжаў, што такое спалучэнне ўласнасці неабходна, так як неабходна сістэма "калектыўных дзяржаўных і грамадскіх мер уздзеяння на рабоў і на свабодных бедных; мер іншы раз звязаных з абмежаваннем правоў свабодна распараджацца прыватнай уласнасцю..."(4). Такая форма ўласнасці, безумоўна, была звязана з структурай поліса, як справядліва зазначае вучоны. Ён піша: "з падачкамі у карысць мас, з некаторым кантролем над свабоднай прыватнагаспадарчай дзейнасцю, з канцэнтрацыяй у руках грамадства і дзяржавы вялікіх матэрыяльных сродкау і з падпарадкаваннем культуры і выхавання грамадзян інтарэсам панавання рабаўладальніцкага калектыва" (5).

Працуючы у БДУ, Уладзімір Мікалаевіч заусёды прыходзіў на дапамогу студэнтам і выкладчыкам, лічыў сваім абавязкам дзяліцца вопытам і ведамі з моладдзю. Ён часта быу старшынёй дзяржаўнай камісіі па прыёму выпускных экзаменаў ва Універсітэце. Для студэнцкай аўдыторыі ім распрацаваны такія неабходныя ў паусядзённым жыцці тэмы лекцый, як "Форма і метады самастойнай работы", "Як працаваць з кнігай"(6). Лекцыі цікавыя тым, што раскрываюць адносіны вучонага да самастойнай навукова-даследчай работы студэнтау гуманітарных факультэтаў. Ён падкрэсліваў неабходнасць навучання студэнтау творчай самаадукацыі, самастойнаму навуковаму мысленню на лекцыях, прак-

тычных і семінарскіх занятках, пры напісанні курсавых і дыпломных работ і навукова-даследчай працы у гуртках.

З пачуццём высокай годнасці і глыбокай павагі адносіўся У.М.Перцау да працы выкладчыка. На яго думку, выкладанне павінна заключаць у сабе элемент творчасці, якая як і ўсякая творчасць, індывідуальна і своеасаблівая. Педагагічны вопыт і мастэрства прыходзілі і ўдасканальваліся не адразу. Уладзімір Мікалаевіч меу магчымасць атрымаць усё гэта працуючы яшчэ да гэтага часу ў гімназіях, камерцыйных вучэльнях, а таксама ствараючы падручнікі, кнігі для чытання па гісторыі, чытаючы лекцыі рабочым, калгаснікам, інтэлігенцыі, выкладаючы у Маскоўскім, Смаленскім і Беларускім універсітэтах, у педагагічных інстытутах Расіі і Беларусі. Яго лекцыі вызначаліся багатым навуковым патэнцыялам і эрудыцыяй. Як піша у сваіх успамінах М.Б.Батвіннік: "Лекцыі адрозніваліся некаторым акадэмізмам, адсутнасцю эмацыянальней афарбоўкі. Але ўменне данесці да слухачоу асноуныя думкі навуковай тэмы выдзялялі лекцыі У.М.Перцава. Ён мудра падводзіў слухачоу да разумення і засваення тэмы лекцыі, да глыбокага роздуму над пастауленымі ў ёй пытаннямі"(7).

Уладзімір Мікалаевіч Перцау загадвау кафедрай гісторыі сярэдніх вякоу БДУ і адначасова распрацоўвау і чытаў курсы лекцый па гісторыі, гістарыяграфіі сярэднявечча, спецыяльныя курсы "Крыніцазнаўства гісторыі сярэдніх вякоу" і "Ідэалогія раннефеадальнага грамадства", вёў спецсемінар "Ранні буржуазны гуманізм". Ён таксама чытаў студэнтам спецыяльны курс "Гісторыя Прусіі ў сярэднія вякі" (са старажытных часоў да фарміравання капіталістычных адносін). Па гэтаму курсу была распрацавана даволі дэталёвая праграма, якая ўключала ў сябе асноўныя палажэнні манаграфіі па гісторыі Прусіі, над якой працаваў У.М.Перцаў.

Педагагічную дзейнасць ён спалучаў з навуковай. Праблемы, якімі займаўся вучоны ў галіне усеагульнай гісторыі, сведчаць пра шырыню інтарэсаў і творчых пошукаў. Выдатнае веданне літаратуры і архіуных фондаў, вытанчанасць і глыбіня аналізу крыніц, надаюць асаблівую каштоўнасць працам У.М.Перцава па антычнай гісторыі і гісторыі заходнееўрапейскага сярэднявечча.

Яшчэ у студэнцкія гады у час наведвання семінараў вядомых прафесараў-гісторыкаў Маскоўскага універсітэта, Перцаў зацікавіўся даследваннем гісторыі Германіі. І ў далейшым, неаднначасова звяртаючыся да гісторыі гэтай краіны, ён імкнуўся зразумець грамадскія працэсы, якія там адбываліся. У 20-я гады асобую ўвагу вучонага прыцягнула праблема абшчыннай уласнасці у старажытных германцаў. Звяртанне да гэтай тэмы не было выпадковым. Справа ў тым, што яшчэ у другой палове XIX ст. буржуазныя вучоныя медыявісты розных накірункаў, спрабуючы апраўдаць будучыя войны Германскай імперыі, культ моцнай дзяржавы і г.д., звяртаюць свой погляд на эканамічную, палітычную гісторыю сярэднявечча. У прыватнасці, у адносінах да гісторыі старажытных германцаў, яны спрабавалі даказаць даўнасць існавання прыватнай зямельнай уласнасці.

У сваім артыкуле "Да пытання аб абшчыннай уласнасці ў старажытных германцаў" (1923)(8). У.М.Перцау спрабуе прааналізаваць працэс развіцця і распаду абшчынных адносін. Гэта сустракаецца і у больш позніх яго працах. У выступленні (1942) супраць фашысцкіх гісторыкаў, якія адстойвалі адвечнасць існавання прыватнай уласнасці, Перцаў даказаў, што ў старажытнасці германскія плямёны не мелі яе на зямлю, у іх існавала абшчынная ўласнасць.

У гады Вялікай Айчыннай вайны вучоны не спыняў сваёй навуковай дзейнасці. З-пад яго пяра выходзяць патрыятычныя артыкулы, якія друкаваліся ў рэспубліканскай газеце "Удмурцкая праўда" (з 1941 па 1943 гг. Перцаў быў загадчыкам і прафесарам кафедры гісторыі Удмурцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута). Як сведчаць матэрыялы сакавіцкай 1942 г. сесіі АН БССР, што праходзіла ў Казані, Ул.М.Перцау пачау распрацоўку даволі актуальнай для таго часу тэмы "Захопніцкая палітыка немцаў на усходзе у XIII-XV стст.". Новая праца прысвячалася даследаванню яе вытокаў.

У той жа час ішла работа над тэмай, дзе вучоны імкнуўся раскрыць агульнае і асаблівае ў ідэалогіі сярэднявечча і фашызму, раскрыць тыя моманты сярэдневяковай гісторыі, якія былі ўзяты на ўзбраенне ідэолагамі. Вынікі гэтай карпатлівай работы былі прадстаулены у дакладзе "Фашызм і сярэдневякоўе"(9), які

быў прачытаны на сесіі АН БССР (12-13 сакавіка 1942 г. у Казані). У сваім выступленні Ул. М. Перцаў падкрэсліваў, што пры усёй блізкасці сярэдневяковай ідэалогіі і ідэалогіі фашызма, не можа быць паміж гэтымі двума светапоглядамі знака роўнасці, бо ўзніклі яны ў розных сацыяльных і палітычных умовах. Аўтар лічыў, што 'пакланенне фашыстаў сярэднявеччу -- усяго толькі шырма, з дапамогай якой яны імкнуцца прыстасаваць да патрэб сучаснага ім грамадства феадальныя ідэі, метады кіравання. Перцавым выкрыта абсурднасць "нардычнай" тэорыі, абапіраючыся на якую фашысцкія гісторыкі імкнуліся апраўдаць і ўзвялічыць захопніцкія паходы нямецкіх феадалаў, існаванне саслоўна-іерархічнай дзяржавы ў сярэднія вякі.

Выкрыццю фашысцкіх фальсіфікацый гісторыі прысвечаны і публіцыстычныя артыкулы Перцава, якія выйшлі у 1945 г. -- "Утварэнне Тэўтонскага ордэна"(10) і "Барацьба палачан і наўгародцаў супраць нямецкіх агрэсараў XIII ст."(11).

У 1942 г. на лістападаўскай сесіі АН БССР, якая праходзіла ў Ташкенце, Ул. М. Перцаў прадставіў праспект свайго даследавання "Прусія да заваявання яе немцамі". Пазней гэту працу часам называлі "Гісторыяй старажытнай Прусіі". З публікацыямі па гэтай тэме вучоны часта выступаў у розных выданнях. Але неабходна усё ж заўважыць, што яшчэ ў дарэвалюцыйныя часы Ул. М. Перцаў выбраў аб'ектам даследавання Прусію і прысвяціў розным аспектам яе гісторыі шэраг артыкулаў. Аднак, Вялікая Айчынная вайна з гітлераўскай Германіяй быццам падштурхнула Перцава працягнуць вывучэнне крыніц прускага мілітарызму. Для гэтага ён заняўся разглядам гісторыі Прусіі са старажытных часоў да XVI ст. У выніку шматгадовай работы была напісана вялікая манаграфія "Прусія да заваявання яе немцамі".

Найбольш буйнымі раздзеламі гэтай работы былі "Прусія па дадзеных антычных аўтараў", "Прусія у барацьбе з немцамі і Польшчай (X-XIII стст.), "Унутраны лад Прусіі перад заваяваннем яе немцамі", "Культура і рэлігія старажытных прусаў". Сваім даследаваннем Перцаў імкнуўся развеяць міф, створаны фашысцкімі гісторыкамі аб вечнасці і непахіснасці панавання немцаў на тэрыторыі Прусіі, а таксама паказаць негрунтоўнасць прэтэнзій Германіі на гэтую тэрыторыю.

На жаль, манаграфія так і засталася ў рукапісу, аб'ёмам у

25 друкаваных аркушаў, які захоўваецца ў архіве АН БССР (12). Апублікаваны толькі асобныя фрагменты гэтай працы ў "Вучоных запісках БДУ імя У. І. Леніна" (13).

Не толькі гісторыя сярэдневяковай Германіі і Прусіі прыцягнула ўвагу вучонага. Шырокі дыяпазон навуковых інтарэсаў даваў магчымасць Ул. М. Перцаву артыкулам, рэцэнзіяй, ці выступленнем прааналізаваць, даць ацэнку, падзяліцца вопытам, выказаць свае думкі па тых, ці іншых праблемах антычнасці і сярэднявечча. Так, Перцаў надаваў увагу распрацоўцы ранняга гуманізму ў Італіі, вызначаў складаны працэс развіцця гуманістычнай культуры у XIV-XV стст., апублікаваў артыкул "Гуманізм у Італіі". Яго прывабілі таксама праблемы гістарыяграфіі. Свае думкі, ацэнкі, вывады вучоны прадставіў у працы "Асноўныя вехі ў развіцці буржуазнай французскай і нямецкай гістарыяграфіі па сярэдневякоўю". Шэраг артыкулаў па антычнай і сярэдневяковай гісторыі напісаны Ул. М. Перцавым для слоўніка Гранат і Вялікай савецкай энцыклапедыі.

Глыбокае і ўсебаковае веданне праблем гістарычнай навукі, асабліва у галіне ўсеагульнай гісторыі, дазволілі даследчыку выступіць на юбілейнай сесіі АН БССР (напярэдадні 30-годдзя ўтварэння СССР) з дакладам, які адлюстроўваў асноўныя накірункі савецкай медыявістыкі. У сваім выступленні ён раскрыў асноўныя праблемы, над якімі працавалі вучоныя, паказаў месца беларускай гістарычнай навукі ў вывучэнні сярэднявечча.

Акадэмік АН БССР Уладзімір Мікалаевіч Перцаў усё сваё жыццё працаваў на карысць Айчыны. Ён так пісаў: "На працягу ўсёй сваёй навуковай і педагагічнай дзейнасці я стараўся прыдаць маёй навуковай і педагагічнай рабоце асветніцкі, гэта значыць не цэхавы, не вузкакабінетны, а карысны для грамадства, шырокіх мас характар".

1. Беларускі дзяржаўны архіў. Ф. 205. Оп. 1. д. хр. 82. Л. 14-17. 2. Там жа Л. 17. 3. Перцев В. Н. О форме собственности в античном обществе//Уч. зап. БГУ. Сер. историч. Вып. 1. Мн., 1939. С. 141-147.

4. Там жа. С. 146-147.

5. Там жа. С. 147.

6. Архив АН РБ, арх. 3, д. 3. Л. 328-333.

7. Ботвинник М. Б. В. Н. Перцев. Мн., 1978. С. 119.

8. Перцев В. Н. К вопросу об общинной собственности у древних германцев//Труды БГУ в Минске. 1923. N 4-5. С. 76-81.

9. Фашизм и средневековье//Материалы мартовской сессии АН БССР (12-13 марта 1942 г. г. Казань) М., 1942. С. 35-57.

10. Перцау Ул. М. Утварэнне Тэўтонскага ордэна//Полымя. 1945. N 2-3. С. 137-154.

11. Перцаў Ул. М. Барацьба палачан і наўгародцаў супраць нямецкіх агрэсараў у XIII ст.//Бальшавік Беларусі. 1945. N 7. С. 55-62.

12. Гл.: Ботвинник М. Б. В. Н. Перцев. Мн., 1978. С. 43.

13. Перцев В. Н. Внутренний строй Пруссии перед завоеванием её немцами//Учёные записки БГУ им. В. И. Ленина. 1951. С. 99-123; 1955. Сер. историч. Вып. 23. С. 99-123; Его же: Культура и религия древних пруссов//Там же. 1953. Сер. историч. Вып. 16. С. 329-373; Его же: Начальные периоды истории древней Пруссии// Там же. 1956. Сер. историч. Вып. 30. С. 109-127; Его же: Хозяйственный и социальный строй древнейшего населения Пруссии (между I-IV ст. н. э.)// Там же. 1959. Сер. историч. Вып. 50. С. 63-81.